В номере:



О важном – достоверно с. 2

Проект поддержат итальянцы с. 11



Выбрать тару для товара с. 6



Раённая масавая газета. Заснавана 24 сакавіка 1935 года

# ДОБРУШСКІ КРАЙ

№8 (10926)

1 лютага 2020 года
Субота



Фары ад снегу Ігар Мядзведзеў ачышчае гэтак жа лёгка, як гарадскія вуліцы 2,5-мятровым адвалам

# Эпіцэнтр студзеньскай завеі

## Уся камунальная тэхніка выйшла на снегаўборку

Снежная ноч 30 студзеня стала асаблівай для вадзіцеля "Добрушскага камунальніка" Ігара Мядзведзева. У кіроўцы з больш чым 20 стажам адбыўся дэбют. У снегаўборцы.

Каманда тэрмінова заступіць на змену прагучала ад дыспетчара каля паловы другой гадзіны ночы. Да абеду на спідометры было ўжо больш за 150 кіламетраў прабегу па заснежаных гарадскіх вуліцах, а з бункера на дарогі высыпана больш за 20 тон пясчана-салянай сумесі.

– Па пятым крузе аб'язджаю горад, – усміхаецца вадзіцель. – Снег хоць і прынёс нямала турбот, аднак абрадаваў.

Экскурсія па начным горадзе, адзначае суразмоўца, таксама стала запамінальнай. Прыкмеціў, як рана прачынаецца горад. Першыя пешаходы на вуліцах з'явіліся каля шасці гадзін раніцы. А да гэтага вадзіцель пастараўся расчысціць вулачкі прыватнага сектара на сваім маршруце.

– Праехаў не толькі цэнтральныя, але і аддаленыя. Хаця да свайго дома не даехаў. Ды і снег у двары не ўбіраў.

Мінулы чацвер стаў першым днём масавай уборкі снегу ў раёне. Надыйшоўшую зіму, няхай і на два месяцы пазней каляндарнай, камунальнікі сустрэлі ў поўнай тэхнічнай гатоўнасці. Як адзначыў старшы механік арганізацыі Павел Белкін, ва ўборцы задзейнічалі 4 адзінкі снегаўборачнай тэхнікі – два трактары, грэйдэр, аўтамабіль МАЗ.

Акрамя тэхнічнай вялася і ручная ачыстка ад снегу. За рыдлёўкі ўзяліся 14 рабочых па ўтрыманні двараваых тэрыторый. Ачышчалі пешаходныя дарожкі, пераходы, тратуары, лесвіцы…

**Наталля ВАСІЛЬЕВА**
**Фота Яўгена УСЦІНАВА**

## Весткі з месцаў

### Вопыт для пераймання

**У Кармянскай СШ прайшоў семінар для педагогаў і прыёмных бацькоў па пытаннях міжведамаснага ўзаемадзеяння ў суправаджэнні выхаванцаў у замяшчальных сем'ях. Яго ўдзельнікамі таксама сталі прадстаўнікі суседняга Веткаўскага раёна.**

– Бацькі такіх сем'яў і настаўнікі падзяліліся з веткаўчанамі вопытам работы, – расказала дырэктар сацыяльна-педагагічнага цэнтра Вольга Заваротная. – Дакладамі семінар не абмежаваўся. Некаторыя метады і прыёмы госці адпрацавалі падчас практычных заняткаў.

**Сяргей ВОЛЬГІН**

### Дапамагаюць з выбарам

**Сёння ў раённы цэнтр дадатковай адукацыі запрасілі старшакласнікаў школ горада на трэнінг па прафарыентацыі.**

Як адзначыла загадчыца аддзела Ірына Чыкізава, нярэдка падлеткі псіхалагічна не падрыхтаваны да гэтага важнага моманту ў жыцці. Падчас трэнінгу 25 школьнікаў паспрабавалі адказаць на пытанні: якія іх патрабаванні да будучай прафесіі, кім яны сябе бачаць у будучым?

Гэта мерапрыемства стала шостым, якое прайшло падчас абласной акцыі "PROFIL_актыка". Нагадаем, яна доўжыцца з 1 лістапада і разлічана на ўвесь навучальны год. На "Псіхалагічны калейдаскоп" старшакласнікаў ужо запрашалі гімназія, праваавыя пытанні былі ў цэнтры ўвагі на брэйн-рынгу ў СШ №5.

**Наталля ХАДУНЬКОВА**

**Дорогие друзья!**

У вас еще есть возможность стать подписчиком газеты «Добрушскі край» с февраля 2020 года.
Оформить подписку можно в отделениях почтовой связи и у почтальонов до 5 февраля включительно.
Будем вместе!
Спешите подписаться!
Цена на месяц – 6,9 рубля.

ISSN 2073-1000

**погода**

Долгота дня 8.52
Луна
1, 2, 3 февраля – в Тельце,
4, 5 – в Близнецах



Первая четверть
2 февраля

**2 февраля**
НОЧЬЮ +3…+5
ДНЕМ +7…+9
Сплошная облачность.
Небольшой дождь.
Ветер ю.-западный 7-9 м/с.

**3 февраля**
НОЧЬЮ +2…+4
ДНЕМ +2…+4
Сплошная облачность.
Возможен мокрый снег.
Ветер западный 4-6 м/с.

ТЕМА НЕДЕЛИ

# Працаваць адказна і эфектыўна

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў нараду, на якой былі разгледжаны чарговыя прапановы па выпраўленні сітуацыі ў аграпрамысловым комплексе Віцебскай вобласці.**

Праблемныя пытанні АПК Віцебскай вобласці ўжо абмяркоўваліся на ўзроўні Кіраўніка дзяржавы ў лістападзе, тады былі дадзены даручэнні для выпраўлення сітуацыі.

"Падыходы нязменныя. Пытанне не толькі і не столькі ў грашах, колькі ў тым, ці зроблены сур'ёзныя высновы па ўсім шлейфе праблем, – заўважыў Кіраўнік дзяржавы.– Ці ёсць выверaныя вытворчыя і фінансавыя планы? Як будзе наведзены парадак у гаспадарчай дзейнасці, і ці ведае кіраўніцкая вертыкаль Віцебшчыны, што ёй рабіць далей?"

## Тэхналагічная дыктатура і дысцыпліна

Прэзідэнт папярэдзіў, што не трэба разлічваць толькі на фінансавую падтрымку прадпрыемстваў з боку дзяржавы. Нават пры яе наяўнасці не ўдасца вырашыць многія праблемы, калі не навесці парадак і дысцыпліну.

Кіраўнік дзяржавы выказаў упэўненасць, што калі кожны на сваім месцы будзе адказна працаваць і клапаціцца аб эфектыўнасці свайго прадпрыемства, то і ў цэлым сітуацыя ў краіне будзе паспяховай.

## Дзяржава падставіць плячо для забеспячэння жыллём маладых аграрыяў

Забеспячэнне людзей жыллём Кіраўнік дзяржавы назваў важнейшым пытаннем. На яго думку, трэба вярнуцца да практыкі будаўніцтва дамоў у аграгарадках.

Будаўніцтвам такога жылля мог бы заняцца філіял Шклоўскага завода газетнай паперы "Домабудаванне", лічыць Аляксандр Лукашэнка.

У якасці іншых мер падтрымкі маладых аграрыяў таксама прапаноўвалася замяніць ім тэрміновую ваенную службу на службу ў рэзерве. Кіраўнік дзяржавы ў цэлым падтрымаў гэту ідэю, але даручыў дэталёва прапрацаваць гэта пытанне. Акрамя таго, размова ішла аб фінансавым стымуляванні маладых спецыялістаў.

## "Віцебскую вобласць трэба разварушыць"

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даручыў дапрацаваць указ, які павінен пасадзейнічаць развіццю аграпрамысловага комплексу Віцебскай вобласці.

Адпаведную задачу ён паставіў, падводзячы вынікі нарады аб першачарговых мерах па забеспячэнні ўстойлівай работы АПК рэгіёна.

Кіраўнік дзяржавы заявіў, што цяпер Віцебскую вобласць "трэба разварушыць". Указ, які павінен пасадзейнічаць развіццю яе аграпрамысловага комплексу, Прэзідэнт даручыў дапрацаваць у бліжэйшыя пару тыдняў.

**Па матэрыялах БелТА**

## З узнагародай!

За шматгадовую плённую працу, высокі прафесіяналізм і вялікі асабісты ўклад у рэалізацыю дзяржаўнай палітыкі ў галіне будаўніцтва і жыллёва-камунальнай гаспадаркі Ганаровай граматай аблвыканкама ўзнагароджаны Сяргей Віктаравіч ПЯТРОЎСКІ, намеснік старшыні райвыканкама.

* * *

За шматгадовую добрасумленную працу ў фінансавай сістэме і высокі прафесіяналізм Ганаровай граматай аблвыканкама ўзнагароджана Людміла Аляксандраўна ГРАМЫКА – загадчыца сектара даходаў бюджэту і фінансаў вытворчай сферы фінансавага аддзела райвыканкама.

НА СВЯЗИ

**3 февраля**
**с 10.00 до 12.00**
**по телефону 2-45-68**
пройдет прямая телефонная линия с участием Надежды Владимировны ШУКАЙЛОВОЙ, начальника отдела землеустройства райисполкома.

ПРОФСОЮЗЫ

# Акцент – на развитие партнерства

*Почти 200 участников четвертого форума Федерации профсоюзов Беларуси «Роль региональных СМИ в развитии социального партнерства» вместе с экспертами в области трудового права, представителями республиканских профсоюзов обсудили актуальные вопросы, касающиеся обновленного Трудового кодекса и новой системы оплаты труда работников бюджетных организаций. Речь также шла о специфике работы СМИ в условиях активного развития цифровых технологий. На встрече побывала журналист «ДК».*

Двухдневное мероприятие проходило в санатории «Криница». От столицы это менее чем в 20 минутах езды на электричке. Уютные номера, внимательное отношение к гостям, красивая природа и благоприятная погода превратили служебную командировку в маленький отдых. Организаторы даже предложили пройти одну из современных оздоровительных процедур.

Благодаря активной позиции профсоюзов в Трудовой кодекс внесена большая часть из 40 поданных предложений и поправок, изменившая около 30 статей.



Круглый стол с участием руководителей ФПБ и Министерства информации



Во время работы форума

Бесконтактный гидромассаж оказался не только полезным, но и приятным.

Деловая часть форума – пресс-конференции, круглые столы, обучающие семинары, работа по группам. Достоверная и самая свежая информация, полученная из первых уст, была полезной как для специалистов по связям с общественностью городских и районных объединений профсоюзов, так и для журналистов.

Накануне вступления в силу обновленного Трудового кодекса большое внимание уделили новациям документа. Заместитель председателя ФПБ Елена Манкевич, юристы Федерации и руководители отраслевых профсоюзов пояснили суть нововведений. Прежде всего – то, что с добросовестными работниками контракты должны заключаться на максимальный срок. Изменения также коснулись материальной ответственности работников за причиненный организации ущерб. В Трудовом кодексе впервые появилось понятие дистанционной работы. На такого работника теперь также распространяются нормы ТК. Введена категория «одинокий родитель».

Следует отметить: Федерация профсоюзов Беларуси впервые в истории страны выступила соразработчиком этого нормативного акта. Благодаря активной позиции профсоюзов в Трудовой кодекс внесена большая часть из 40 поданных предложений и поправок, изменившая около 30 статей. Специалисты ФПБ будут проводить мониторинги по включению в контракты и коллективные договоры новых норм.

Наиболее ожидаемой и запоминающейся для участников форума была встреча с председателем ФПБ Михаилом Ордой и министром информации Александром Карлюкевичем. Общение проходило в формате диалога, живо и интересно.

– Чтобы быть авторитетным, нужно делать много нужного и полезного людям, – отметил в своем выступлении Михаил Орда. – В ближайшие пять лет главной задачей организации останется правовая защита трудящихся. За пять лет при нашем участии 418 человек смогли вернуться на работу.

Приоритетными направлениями останутся и развитие профсоюзного туризма, контроль над соблюдением техники безопасности. По словам председателя ФПБ, профсоюзным движением охвачено 93 процента экономически активного населения страны.

Задать спикерам волнующие вопросы мог каждый. А на мастер-классах от профессионалов, которые поделились опытом эффективной работы в интернет-пространстве, журналисты получили много полезных знаний.

**Людмила НАЗАРОВА**